УДК 882.6-09

***В.І. ЕЎМЯНЬКОЎ***

# ДЫЯЛЕКТЫКА ДАБРА І ЗЛА Ў КАНТЭКСЦЕ ЭСТЭТЫКІ І ТЭОРЫІ РАМАНТЫЗМУ

Рамантызм у літаратуры Беларусі, Польшчы і Украіны першай паловы XIX ст. прадстаўлены дзейнасцю так званай Віленска-Ковенскай школы, інакш Літоўскай школы польскага рамантызму. Прадстаўнікамі гэтай школы з'яўляюцца: Адам Міцкевіч, Юліўш Славацкі, Аляксандр Ходзька, Тамаш Зан, Севярын Гашчыньскі, Юзаф Крашэўскі. Абапіраючыся на багаты вопыт суседніх літаратур, «віленцы» здолелі выпрацаваць уласную сістэму поглядаў, адным з філасофскіх падмуркаў якой з'яўляецца паняцце «das All» (абсалютнае Усё) [10, с. 74].

Абсалютнае Усё ў кантэксце «Філасофіі мастацтва» Ф. Шэлінга супадае з абстрактным паняццем Бог, як персаніфікаваным першапачаткам быцця свету. Аднак, Бог «рамантыкаў» адначасова з'яўляецца суб'ектам і аб'ектам стварэння: «<...> успрымаецца як прырода» [10, с. 129], у адрозненні ад універсума хрысціянства, які «<...> ёсць космас маралі» [10, с. 129]. Стваральнік Усяго, ён паўстае таксама і як глабальная душа створанага ім свету. Бог, такім чынам, – гэта тая ідэальная агульная форма, якая ўтрымлівае ў сабе безліч магчымасцей (патэнцый) для рэпрэзентацыі ў адзінкавым. Падкрэслім: абсалютнае Усё – таксама і абсалютнае неадрозненне рэальнага і ідэальнага. Адзінкавае існуе толькі як адбітак абсалютнага ідэальнага першавобраза, увасабленне адной з бясконцых патэнцый Бога. Па гэтай прычыне паміж абсалютнай формай і рэальным яе ўвасабленнем ёсць вядомая розніца. Форма абсалютнага першавобраза бясконца дасканалая, і наадварот: яе адбітак (адзінкавая рэпрэзентацыя) такой дасканаласцю не валодае.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У межах праблемы дыялектычнай узаемасувязі дабра і зла паняцце «дасканаласць» мае важнае значэнне і патрабуе аналізу. Па-першае, абсалютнае Усё атаясамліваецца з вечнасцю, бо Богу не ўласціва ніякае іншае існаванне, акрамя існавання як ідэі [10, с. 75], і наадварот – адзінкавыя рэчы існуюць у часе. З гэтага дапушчэння вынікае першая адзнака дасканаласці: абсалютнае (боскае) не залежыць ад часу, і наадварот – адзінкавае па сваёй сутнасці канчатковае, а таму недасканалае. Па-другое, усё неабсалютнае існуе толькі як пазбаўленасць, пэўным чынам абмежаванне ідэальнага і бясконцага ў матэрыяльным і канчатковым. Першавобраз ёсць форма, дзе змяшчаюцца ўсе магчымыя для развіцця патэнцыі, адбітак гэтага першавобраза ўжо таму недасканалы, што ўтрымлівае ў сабе толькі частку дасканаласці абсалюта. Па-трэцяе, абсалютнае Усё паядноўвае ў сабе тры ідэі: прыгажосць, праўду, дабро. Гэтае трыадзінства і ёсць сутнасць Боскай гармоніі, адзнака дасканалага першавобраза. Так, прыгажосць існуе ўсюды, дзе сплятаюцца ідэальнае і рэальнае, а канкрэтнае і адзінкавае робіцца падобным на свой першавобраз. Гэтым «максімальным набліжэннем» рэальнага да ідэальнага першае набывае сапраўдную рэальнасць (боскасць) і здольнасць да самасцвярджэння ў свеце матэрыяльных рэчаў. Такім чынам, прыгажосць, як шлях да ідэальнага першавобраза, адначасова і шлях да праўды існавання (як мы ўжо згадвалі, толькі ідэальнае існуе само па сабе, а гэта значыць: валодае сапраўднай незалежнай і неабумоўленай рэальнасцю). Заўважым, што Святы Аўгусцін у «Градзе Боскім» таксама сцвярджае, што «<...> сама праўда ёсць Бог...» [Кніга XI; глава II]. Абсалютна прыгожы (дасканалы) Бог разам з тым і бясконца добры. Апошняе сцверджанне (параўнаем са сцверджаннем абсалютнага дабра Стваральніка ў «Градзе Боскім» Святога Аўгусціна [Кніга XI; глава XXI]) у разуменні рамантыкаў вынікае з таго, што дабро і зло існуюць як супрацьпастаўленне Боскай дасканаласці (бясконца пазітыўнай) і прафаннай недасканаласці прыроды створанага свету. Набліжэнне да абсалютнай формы Стварэння ў гэтым выпадку ёсць набліжэнне да гармоніі, а гэта значыць – да дабра. Такім чынам, добрае ўсё тое, што з'яўляецца абсалютна прыгожым, і наадварот: усё непрыгожае тлумачыцца як зло-скажэнне абсалютна дасканалага першавобраза. Аднак, прыгажосць «<...> з'яўляецца там, дзе сплятаюцца святло і матэрыя, ідэальнае і рэальнае...» [10, с. 81]. Адсюль вынікае, што «мёртвая матэрыя», пазбаўленая неадрознення з ідэальнасцю – толькі «<...> тло, матэрыя і годзе» [5, с. 371] (максімальнае зло-скажэнне першавобраза).

Важна падкрэсліць, што супрацьпастаўленне дабро – зло, менавіта ў гэтым сэнсе іх тлумачэння, супадае з апазіцыяй «ідэальнае мінулае» («лепшыя часы») і «наш век» (век, па словах А. Міцкевіча, «няўдалы» [4, с. 262]). «Даўнія часы», як бліжэйшыя да абсалютнай формы Усяго, уяўляліся як больш дасканалыя (добрыя, прыгожыя, праўдзівыя). Разам з тым, ідэальнасць мінулай прыроды канчаткова не згасла і ў прыродзе сучаснай. Падкрэслім, «наш век» максімальна аддаліўся ад дасканалага першавобраза, дзякуючы рэгрэсу ўзнаўлення, але «памяць» аб дасканаласці ў матэрыі захавалася. Спасціжэнне праўды (дасканаласці) ў прыродзе робіцца магчымым дзякуючы «адчуванню і веры». Розум (як сімвал рацыянальнасці сучаснага) здольны спасцігнуць толькі матэрыю – праўду мёртвую. Таму ў вершы «Рамантычнасць» А. Міцкевіча прырода «нашага веку» раздвойваецца. У візіі «мудраца» (параўнаем: у візіі ксяндза – IV ч. «Дзяды») яна абсалютная рэальнасць; у візіі дзяўчыны (параўнаем: у візіі Густава) абсалютнае неадрозненне ідэальнасці і рэальнасці. Дзяўчына бачыць духаў і прывідаў, а «вока і шкельца» мудраца нічога таго не заўважаюць. Словамі «злыя людзі» азначае паэт сляпых душой. Злыя, падкрэслім, не ў сэнсе

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

маралі, але ў сэнсе – недасканалыя, максімальна пазбаўленыя душы, не здольныя заўважыць ідэальнасць акаляючай жывой прыроды. Такім чынам, свет мінулага – гэта свет «адчування і веры», звышпачуццёвая прастора, абсалютная духоўнасць якой вынікае з перавагі ідэальнага ў матэрыяльным. Гэта значыць, мінулае адначасова і максімум дасканаласці ў свеце рэпрэзентацый абсалютнай формы Усяго. З апошняга сцверджання робіцца відавочным тое, што мінулае і сучаснае супрацьпастаўляюцца таксама і як дабро – зло-скажэнне; у гэтым выпадку мінулае, на ўзроўні архетыпічнага мыслення беларускіх рамантыкаў, адпавядала страчанаму ў прасторы сучаснай Літвы язычніцкаму раю Літвы легендарнай.

Актуалізацыя паняцця «язычніцкі рай» у дадзеным выпадку свядомая, і вынікае з наступных разважанняў. Хрысціянскі рай – гэта абсалютная духоўнасць ідэальнага космасу. Чалавечае жыццё на зямлі, напрыклад Святым Аўгусцінам [Кніга XIII; глава II], тлумачыцца як часовае і недасканалае быццё бясконцага ў канчатковым (душы ў межах цела). Неўміручасцю валодае толькі ідэальная частка чалавека – душа, якая пасля страты матэрыяльнай абалонкі (турмы для душы) вяртаецца да ідэальнага існавання побач з анёламі. Падкрэслім: «<...> каб патрапіць зноў на неба» [3, с. 28] душы патрэбна, па-першае, спраўдзіць сэнс існавання хрысціяніна, па-другое, пазбавіцца ад матэрыяльнасці (памерці). Што датычыцца язычніцкага рая, то гэта, хутчэй, звышпачуццёвая прастора абсалютнага супадзення ідэальнасці ў рэальнасці, душы ў матэрыі. Таму, дзеля вяртання ў язычніцкі рай, страта матэрыяльнасці не з'яўляецца безумоўна неабходнай.

Падкрэслім: вяртанне ў язычніцкі рай на зямлі (як сімвала рэальнасці) ў кантэксце рамантычнай эстэтыкі ўяўляецца мажлівым. Дзеля гэтага неабходна максімальна наблізіць рэальнасць да ідэальнасці, адчыніць брамы, якія з «нашага няўдалага веку» вядуць у свет звышпачуццяў мінулага. Іншымі словамі: вяртанне ў язычніцкі рай – гэта актуалізацыя бясконцага ў канчатковым, абуджэнне душы ў «мёртвай матэрыі» пры дапамозе адчування і веры. Аднак, фактычна, «рай» рамантыкаў быў той прасторай, у якой жыццё рэальнае набывала альтэрнатыву паралельнага існавання. Набліжэнне да яго было мажлівым толькі ў свядомасці (дзякуючы інтэлектуальнаму перастварэнню рэальнага і набліжэнню адзінкавага да агульнага), таму фізічнае існаванне і існаванне ў свядомасці робяцца паралельнымі, аднак, узаемазалежнымі існаваннямі адной і той жа экзістэнцыі ў яе абсалютнай раздвоенасці – існаванні душы ў прасторы пачуццяў і цела ў прасторы фізічнай рэальнасці (А. Міцкевіч «Рамантычнасць»).

Здзяйсняемыя Віленска-Ковенскімі рамантыкамі пошукі дасканалага першавобраза на пачатку XIX ст. абудзілі да жыцця своеасаблівую пераходную зону паміж цывілізацыяй «нашага веку» і «лепшымі часамі» мінулага. Але, перадусім, заўважым, што абстрактнае паняцце «даўнія часы» Наваліса ў дадзеным выпадку набыло выразную адзнаку гістарызму і атаясамліваецца з перыядам існавання паганскай Літвы, як супольнай крывіцка-жамойцкай дзяржавы. Легендарная гісторыя «Літвы! Айчыны Любай...» («Пан Тадэвуш») у творчасці рамантыкаў набывае абсалютна незалежнае ад часу існаванне (ідэальнае быццё «<...> больш рэальнае, чым сама рэальнасць» [10, с. 91]) і робіцца часткай «нашага веку» дзякуючы суб'ектыўнаму бачанню паэта (А. Міцкевіч «Ода да маладосці»). Падмурак такога бачання складала духоўная прастора краіны (яе культура, міфалогія, вераванні). Язычніцкая Літва, як край «першапачатку» (вырай – крывіцкае; Анафеляс – жамойцкае), уяўляўся рамантыкам Віленска-Ковенскай школы як свет «сапраўды жывы» (ідэальны), населены духамі і багамі, свет, максімальна набліжаны да свайго Дэміурга. Ідэальнасці «язычніцкай Літвы» супрацьстаяў

хрысціянскі «няўдалы» век (XIX стагоддзе), які ў творчасці рамантыкаў тлумачыўся як своеасаблівы востраў мёртвых вобразаў Усяго («тло, матэрыя»), акружаны «свяшчэннай цішынёй» і адмежаваны ад надземнага свету неба. Палярызацыя рэчаіснасці не мела, аднак, на мэце адмаўленне хрысціянства як сістэмы светапогляду. Вяртанне да Літвы «даўніх часоў» тлумачылася, як набліжэнне да «праўдзівай веры» свайго народа, затлумлёнай розумам шматлікіх пакаленняў і сапсаванай уплывам заходняга рацыяналізму. Па гэтай прычыне аб'ект перастварэння (не-Я), хрысціянскі космас сучаснасці, пэўным чынам пранікае ў язычніцкі космас мінулага. І вызначальнай якасцю творчасці, у гэтым выпадку, робіцца ідэалагічнае «перамяшанне» (А. Міцкевіч «Дзяды» [3, с. 23]) біблейнай фактуальнасці і фактуальнасці міфалагічнай (прычым у міфалогіі таксама навідавоку перамяшанне: старазапаветная «міфалогія» мяшаецца з міфалогіяй славянскай, жамойцкай, антычнай). Задачай творцы, у гэтым выпадку, з'яўляецца сцверджанне універсума як абсалютнага Усяго і адмаўленне адной з яго ідэй – ідэі вайны і смерці (як асноўных фактараў недасканаласці «нашага веку»).

Відавочна, што ідэя існавання абсалютнага Усяго карэнным чынам змяняе хрысціянскую канцэпцыю дабра і зла. Па-першае, звернем увагу на тое, што ў біблейнай традыцыі Бог стварыў толькі чалавека па ўласнаму вобразу, гэта значыць – толькі чалавек валодаў ідэальнай часткай абсалютнага Усяго, а прырода ў Святым Пісанні падаецца як матэрыя, цалкам пазбаўленая духоўнасці (прырода ў адносінах да чалавека знаходзіцца ў стане залежным, падпарадкаваным яго волі [Кніга роду І; 26-30]). Эстэтыка рамантызму, насуперак таму, адухаўляе і прыроду, робячы яе часткай абсалютнага Усяго. Па-другое, хрысціяне тлумачаць існаванне зла ў свеце як вынік грэхападзення першага чалавека (нягледзячы на тое, што прычыну гэтага грэхападзення Аўгусцін, напрыклад, заўважае ў недасканаласці (defectio) створанага Богам «з пылу зямлі» чалавека [Кніга Роду ІІ; 7]). Прырода ў гэтым выпадку застаецца па-за межамі дабра і зла, а стрыжнем маралі з'яўляецца паняцце грэху (недасканаласці чалавека: «<...> злая воля не з таго пачалася, што яна прырода, а з таго, што прырода створана з нічога» [1, с. 16]). У «Філасофіі мастацтва» (тэрмін, выкарыстаны Шэлінгам) сутнасць дабра і зла вызначае паняцце дасканаласць (добры = дасканалы) і ўжываецца ў адносінах не толькі чалавека, але і ўсяго створанага. Па-трэцяе, у адрозненні ад хрысціянскай сістэмы вартасцяў, рамантыкі з паняцця дабра не выключаюць паняцце цялеснасці, сцвярджаючы абсалют дасканаласці таксама і як абсалют прыгажосці.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Августин Блаженный.*** О граде Божием. – Москва, 1985.
2. ***Kraszewski J.I.*** Anafielas. Piesni z podan Litwy. – Warszawa, 1846.
3. ***Мицкевич А.*** Дзяды. – Мінск, 1965.
4. ***Міцкевіч А.*** Вершы і паэмы. - Мінск, 2000.
5. ***Міцкевіч А.*** Пан Тадэвуш. – Мінск, 1998.
6. ***Ницше Ф.*** Избранные произведения. – Москва, 1993.
7. ***Новалис.*** Гейнрих фон Офтердинген. – Москва, 1996.
8. Стары запавет. У выданні Бібліі ангельскім хрысціянскім таварыствам. – Лондан, 1991.
9. ***Сыракомля Ул.*** Добрыя весці. – Мінск, 1993.
10. ***Шеллинг Ф.*** «Философия искусства». – Москва, 1978.


## SUMMARY

*The peculiarities of Belarusian Romanticism in its correlation to Polish and other European (writers) authors are investigated in the article titled «The dialectics of Good and Evil in the context of aesthetics and the theory of Romanticism».*